# СВЕЖАСЦЬ І ТРЫВАЛАСЦЬ НА НЕКАЛЬКІ ПАКАЛЕННЯЎ

## ПАРЫЗАВАНАЯ КЕРАМІКА РАДАШКОВІЦКАГА КЕРАМІЧНАГА ЗАВОДА — СРОДАК «ВЫЛЕПІЦЬ» ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ВАШАГА ДОМА

**Інвестыцыі ў жыллё — пэўна, самы доўгатэрміновы і важны ўнёсак, які можа зрабіць кемлівы гаспадар. Дыхтоўны будынак паслужыць не аднаму пакаленню, калі пры яго стварэнні чалавек думае не толькі аб прыгажосці і кошце, але не забываецца на ўтульнасць, надзейнасць і бяспечнасць жыцця ў будучым доме. Каб атрымаць экалагічнае, трывалае і індывідуальнае збудаванне, патрэбен матэрыял, здольны спалучыць у сабе ўсе гэтыя ўласцівасці. Самы прывабны варыянт — кераміка, з якой створаны і старажытныя беларускія вежы, і сучасныя дзіцячыя садкі ды школы.**

Керамічныя вырабы — традыцыйны матэрыял, з якога ў свеце ўжо не адно стагоддзе будуюць і шматпавярховікі, і прыватныя сядзібы. Уласцівасці керамікі гарантавана застануцца нязменнымі гадоў 150-200, а «пражывуць» будынкі яшчэ больш. Апроч доўгай службы, будынкі з парызаванага прадукту вылучаюцца сваёй экалагічнасцю — лепш дыхаецца толькі ў драўлянай хаце.


Дырэктар ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» Алег МІШЧАНКА.

— Дом будуецца не на год-два або дзесяць. Атрымаўшы імгненную выгаду ў момант будаўніцтва, чалавек не думае, што танны варыянт хутчэй сапсуецца і запатрабуе дадатковых грашовых укладанняў. Вельмі хутка яны перавысяць сэканомленыя зараз «капейкі», ператварыўшы іх у «рублі», — расказаў **Алег МІШЧАНКА, дырэктар ААТ «Радашковіцкі керамічны завод»,** разважаючы пра асаблівасці індывідуальнай будоўлі ў Беларусі. — Нашы суайчыннікі прызвычаіліся арыентавацца на тое, каб было, «як у суседа». У выніку часта атрымліваецца, што цэлыя пасёлкі ствараюцца не толькі з аднаго матэрыялу, а і па адным праекце. Гэта ўсё адно што аднолькава апранацца. Я прыхільнік эксклюзіўных варыянтаў дамоў, якія падкрэсліваюць індывідуальнасць іх гаспадара. Трэба ставіцца да жылля як да гістарычнай каштоўнасці, што сімвалізуе сувязь пакаленняў і спадчыннасць, замест таго каб імкнуцца да навізны і ўльтрасучасных збудаванняў, камфортны тэрмін жыцця ў якіх не дасягае нават паўстагоддзя. Беларусь — краіна прыроды, і ёй усё ж больш пасуюць будынкі з цэглы.

### ЭКАНОМНЫЯ ЯКАСЦІ

Новая прадукцыя Радашковіцкага керамічнага завода — парызаваныя керамічныя сценавыя блокі — настолькі ўніверсальны матэрыял, што з іх, як з пластыліну, можна ствараць разнастайныя архітэктурныя формы ў розных стылях. Дзякуючы некалькім варыянтам памераў блокаў з іх можна рабіць як апорныя сцены, так і ўнутраныя перагародкі. Самы буйны памер блока — 9 NF (510х250х138 мм) — перавышае аб' ём звычайнага ў 9 разоў. А 2NF (250х120х138 мм), напрыклад, адпавядае па велічыні дзвюм звычайным цаглінам. Дзякуючы буйным памерам блокаў тэмпы кладкі будынка павялічваюцца ў два-тры разы. Праз выкарыстанне буйнафарматных керамічных блокаў у 12 разоў скарачаецца колькасць «масткоў холаду» ў сцяне.

Збудаваўшы дом з керамікі, не трэба чакаць, пакуль ён «усядзецца» — такога проста не адбываецца. Скончыўшы будоўлю, можна адразу прымацца за адстройванне дома і не непакоіцца, што праз некалькі гадоў прыйдзецца рамантаваць фасад. Будынак з керамікі можна аздабляць чым заўгодна: атынкоўваць або абліцоўваць вонкавай ці клінкернай цэглай, фарбаваць. Для лепшага спалучэння з аддзелачнымі матэрыяламі блокі рабрыстыя па баках.


Уладзімір ЗАРОЎСКІ, вядучы інжынер па аўтаматызацыі сістэм кіравання, на фоне дома, які ён пабудаваў сваімі рукамі.

Карыстаючыся парызаванай керамікай, дарэчы, можна сэканоміць прыкладна 10—15% і пры канструяванні падмурка. Блокі важаць на 30% меней, чым звычайныя пустацелыя цагліны, таму не будуць ствараць моцны ціск на фундамент. Праз меншую вагу памяншаюцца таксама затраты на лагістыку. За адзін рэйс звычайна можна перавезці 7-8 тысяч звычайных цаглін, а керамічных — 11 тысяч. Сабекошт жыллёвых метраў пры гэтым таксама выйграе, бо цана блокаў прыкладна на 25% ніжэйшая, чым звычайных цаглін.

Акрамя таго, кераміка валодае нізкай цеплаправоднасцю — яна дазваляе захоўваць цяпло ў памяшканні ўзімку і ствараць прахалоду летам. Цепла- і гукаізаляцыя ў керамічнай «парызоўкі» ўдвая вышэйшая, чым у звычайных цаглін.

Прадпрыемства штогод удасканальвае якасць сваёй прадукцыі і мадэрнізуе тэхналагічнасць вытворчасці. За апошнія 10 гадоў тут абнавілі асноўныя ключавыя вузлы і наладзілі працу самага сучаснага абсталявання: швейцарскага, італьянскага, нямецкага, іспанскага, французскага — лепшага, што ёсць у еўрапейскіх вытворцаў.

Керамічныя цагліны выпрабляюцца метадам пластычнага фармавання на французскай лініі фірмы CERIK, якая ўсталявала сваю прадукцыю на прадпрыемстве цалкам «пад ключ».

### ЗА ДВУХПАВЯРХОВЫ КАТЭДЖ — ЯК ЗА ДВУХПАКАЁЎКУ

Пра карысныя ўласцівасці прадукцыі завода сведчыць і тое, што некаторыя яго працаўнікі будуюць жыллё менавіта з парызаванай керамікі, створанай, што называецца, уласнымі рукамі. Сярод іх Уладзімір ЗАРОЎСКІ, вядучы інжынер па аўтаматызацыі сістэм кіравання, які проста праз паветра ўнутры дома адчувае, што такое свежасць, натуральнасць і камфортная тэмпература:

— Раней я жыў у кватэры ў маналітным доме. Апошнія два гады ва ўласным доме з керамічных блокаў я адчуваю сябе так, быццам на свежым паветры знаходжуся. Не думаю ні пра вільгаць, ні пра мароз. Калі я выводзіў сцены, то клаў раствор толькі па баках цагліны: знешнім і ўнутраным краях, а не на ўсю шырыню, каб не стваралася скразных «масткоў холаду». Дарэчы, іх адразу атрымалася ў 9 разоў менш, бо я будаваўся з блокаў 9 NF.

Уладзімір Ягоравіч узводзіў сцены сам (хоць валодае не спецыяльнымі будаўнічымі ведамі, а ўмелымі рукамі і разумнай галавою), разам са сваякамі. Ён пакуль не адстройваў дом звонку ніякімі дэкаратыўнымі матэрыяламі. Пры гэтым ён выглядае вельмі прывабна. Два паверхі з чырвона-аранжавых блокаў з непрыкметнымі воку адценнямі глядзяцца, як суцэльны і закончаны варыянт будынка, абкладзены вонкавай цэглай. Пры гэтым рабрыстая паверхня керамікі, здаецца, выконвае яшчэ і дадатковую дэкаратыўную функцыю.

Ва ўсім катэджы, пачынаючы з цокальнага памяшкання і заканчваючы гарышчам, узімку пастаянна трымалася 20 градусаў, пры тым што пакоі ў доме не ізаляваныя. Гэта камфортная для гаспадароў тэмпература, якую з лёгкасцю можна было б павысіць. Зрэшты, за абагрэў 280 м² ён плаціў прыкладна 450 тысяч рублёў у месяц — у столькі ж абыходзілася і старая двухпакаёўка.

**Да ўсіх пералічаных выйгрышных момантаў ад скарыстання прадукцыі радашковіцкага завода прадпрыемства дадае яшчэ адну вельмі важкую прычыну паспрабаваць гэты матэрыял у справе. Да канца чэрвеня фізічным асобам прапануецца набыць керамічныя блокі з 30-працэнтнай зніжкай. Пры гэтым іх кошт становіцца амаль такім жа, як у газасілікатных блокаў.**

**Увесь гэты час дзейнічае спецыяльная цана на транспарт: ад 10 тысяч рублёў за кіламетр. Сюды ўваходзіць і праца спецыяльнай машыны з маніпулятарам, якая разгрузіць матэрыял на аб'екце. Так што гаспадарам не прыйдзецца дадаткова наймаць кран. Прывоз на машыне без маніпулятара абыдзецца ўвогуле ад 8 тысяч рублёў за кіламетр.**



**— Такім чынам мы імкнёмся дапамагчы тым, хто хоча і сэканоміць, і атрымаць якасны прадукт. Паказаць, што выніковую выгаду трэба падлічваць зыходзячы не толькі з цаны матэрыялу, а з канчатковай цаны на аб'екце будоўлі, — патлумачыў дырэктар. — 70% нашых блокаў ідзе на экспарт у Расію. Суседскія спажыўцы, як дзяржаўныя, так і прыватныя, ужо адчулі смак ад будоўлі з такіх матэрыялаў. А нашы людзі чым горшыя? Калі яны ўсё жыццё збіралі на свой дом, дык чаму б нам не пасадзейнічаць ім у пабудове не толькі надзейнага і моцнага, але чыстага і карыснага для здаровага жыцця жылля.**


Аператар фармоўкі Аляксандр ЯКУБОЎСКІ сочыць за фармоўкай, нарэзкай і загрузкай цэглы на сушыльныя ваганеткі.

**Набыць парызаваную керамічную цэглу можна не толькі на прадпрыемстве, а і ў афіцыйнага дылера завода на гандлёвай пляцоўцы «Аграмол»: г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 199. Падрабязней азнаёміцца з прадукцыяй прадпрыемства можна на сайце rkz.by або ў аддзеле збыту па тэлефоне 689-80-80 (адзіны нумар для ўсіх мабільных апаратараў).**

УНН 600077710